№10 (239)
2008

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь



# Моладзь пратэстуе...

16 мая, у Дзень беларускай салідарнасьці, актывісты грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" і іншых моладзевых і грамадзкіх ініцыятываў правялі адразу некалькі акцыяў з патрабаваньнем вызваліць палітзьняволеных.

Актывісты "Еўрапейскай Беларусі" выйшлі на праспект Незалежнасьці ў Менску з прымацаванымі да сьпіны партрэтамі палітвязьняў і тлумачэньнем да іх. Так, на партрэце Сяргея Парсюкевіча было напісана – "Сяргей Парсюкевіч, прадпрымальнік, атрымаў 2,5 гады калоніі".

Удзельнікі акцыі сталі ўздоўж сьценаў будынкаў з закладзенымі за галаву рукамі сьпіной да мінакоў – каб былі бачныя плакаты.

Затым актывісты "Еўрапейскай Беларусі" разам з іншымі ўдзельнікамі дэмакратычнага руху прынялі ўдзел у акцыі салідарнасьці на Кастрычніцкай плошчы ў Менску. Людзі выйшлі на плошчу таксама з патрабаваньнем вызваліць палітвязьняў. Людзі стаялі ланцугом на Кастрычніцкай плошчы, трымаючы ў руках партрэты палітзьняволеных Аляксандра Казуліна, Андрэя Кіма, Сяргея Парсюкевіча, а таксама ўдзельнікаў "Працэсу 14-ці" – актывістаў, асуджаных за ўдзел у акцыях пратэсту прадпрымальнікаў.

Як толькі ўдзельнікі акцыі выстраіліся з партрэтамі, да іх падышоў супрацоўнік міліцыі ў цывільным у суправаджэньні двух дзесяткаў супрацоўнікаў АМАПу. Міліцыянт праз мегафон заявіў,

*(Працяг на стар. 7)*






Менск, 16 траўня 2008 г.

## "Беларусь застаецца несвабоднай краінай"

**Міжнародная арганізацыя Amnesty International выдала штогадовую справаздачу аб становішчы з правамі чалавека ў сьвеце за мінулы год (з траўня 2007 па травень 2008 г.). У разьдзеле дакладу, прысьвечаным Беларусі, адзначаецца ціск уладаў на грамадзянскую супольнасьць, юрыдычны перасьлед апазіцыйных актывістаў, а таксама працяг выкананьня сьмяротных пакараньняў.**

**Сёлетняя справаздача Amnesty International сапраўды пацьвярджае, што Беларусь застаецца несвабоднай краінай. У разьдзеле справаздачы, прысьвечаным Беларусі, нагадваецца, што ў сьнежні летась Генеральная асамблея ААН прыняла рэзалюцыю, у якой асуджаюцца парушэньні правоў чалавека ў Беларусі.**

**Пералічваючы выпадкі парушэньня права на свабоду выказваньня ў Беларусі, Amnesty International асабліва засяроджвае ўвагу на двух сюжэтах: зьняволеньні былога кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна, які адбывае тэрмін за арганізацыю мірнай дэманстрацыі, і рэпрэсіі ўладаў супраць удзельнікаў сёлетніх дэманстрацыяў на Дзень Волі 25 сакавіка.**

**У частцы справаздачы, якая тычыцца парушэньняў свабоды асацыяцыяў, гаворыцца пра шматлікія выпадкі крымінальнага перасьледу актывістаў Маладога Фронту, якія прыцягваліся да адказнасьці за "дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі". Таксама прыгадваецца выпадак з праваабарончай арганізацыяй "Вясна", якая была ліквідаваная ў 2003 годзе. Летась у ліпені Камітэт ААН па правах чалавека прыняў пастанову, у якой расцаніў ліквідацыю "Вясны" як парушэньне беларускімі ўладамі права на свабоду асацыяцыяў. Пасьля гэтага рашэньня сябры ліквідаванай арганізацыі падалі заяву на новую рэгістрацыю, але атрымалі адмову.**

**У частцы, якая тычыцца свабоды сумленьня, адзначаецца, што адпаведны закон, прыняты ў Беларусі ў 2002 годзе, дае магчымасьць весьці паўнацэнную дзейнасьць толькі зарэгістраваным канфесіям. Пры гэтым многія пратэстанцкія цэрквы сутыкаюцца са шматлікімі перашкодамі. Amnesty International прыводзіць выпадак пратэстанцкага пастара Яраслава Лукашыка. Ён быў арыштаваны па абвінавачаньні ў "незаконнай рэлігійнай дзейнасьці", а потым дэпартаваны з краіны, хоць жонка і трое дзяцей пастара — грамадзяне Беларусі.**

**Змаганьне супраць сьмяротнага пакараньня было адным з галоўных напрамкаў дзейнасьці Amnesty International ад пачатку яе стварэньня. Юрыдычная практыка Беларусі кідае выклік гэтым памкненьням арганізацыі. Беларусь – адзіная краіна ня толькі ў Еўропе, але і ў рэгіёне, якая працягвае выконваць сьмяротныя пакараньні. Нават Узьбекістан абвясьціў мараторый на іх выкананьне з пачатку гэтага году, у Беларусі ж, паводле Amnesty International, сёлета ў лютым былі выкананыя тры сьмяротныя прысуды.**

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*

# КДБ перасьледуе праваабаронцаў

23 траўня 2008 году ў кватэру да вядомага віцебскага праваабаронцы Леаніда Сьвеціка нечакана ўварваліся тры супрацоўнікі КДБ з загадзя падрыхтаванымі панятымі. Гаспадару кватэры яны прад’явілі пастанову пракуратуры аб узбуджэньні крымінальнай справы па арт. 130.1 Крымінальнага кодэксу РБ (распальваньне міжнацыянальнай і міжканфесійнай варожасьці). Згодна з пастановай, Леанід Сьвецік зьяўляецца сьведкам па факце пагрозаў да некаторых грамадзянаў з боку мясцовага РНЕ.

Яны папярэдзілі, што на гэтай падставе ў кватэры адбудзецца вобыск.Ператрус, якім кіраваў дазнавальнік, старшы лейтэнант КДБ Д.Садковіч, цягнуўся з 9 раніцы да 18 гадзінаў вечару. Падчасператрусу былі забраныя для правядзеньня далейшых сьледчых дзеяньняў кампутар, іншае тэхнічнае абсталяваньне, праваабарончая друкаваная прадукцыя, сярод якой былі каляндарыкі, прысьвечаныя 60-годзьдзю заснаваньня ААН.

Затым, разам з канфіскаванымі матэрыяламі і аргтэхнікай, супрацоўнікі КДБ адвезьлі Леаніда Сьвеціка ва ўпраўленьне КДБ па Віцебскай вобласьці. Дазнавальнік Д.Садковіч дапытваў праваабаронцу больш за дзьве гадзіны. Допыт здымаўся на відэакамеру. Потым ён ўручыў Л.Сьвеціку позву для далейшага допыту ў якасьці сьведкі на 28 траўня.

Віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH) праваабаронца Алесь Бяляцкі пракаментаваў гэты інцыдэнт як факт грубага парушэньня правоў чалавека: "Відавочна, што непрыкрыты ціск уладаў на віцебскага праваабаронцу Леаніда Сьвеціка зьвязаны з ягонай актыўнай праваабарончай дзейнасьцю і бескампраміснай грамадзянскай пазіцыяй, скіраванай на абарону правоў беларускіх грамадзянаў. У 2007 годзе ён быў звольнены з працы выкладчыка да сканчэньня тэрміну кантракту. Сёньня ж улады нахабна прадэманстравалі цынізм, фактычна абвінавачваючы праваабаронцу ў распальваньні нацыянальнай варожасьці. У той час як Леанід Сьвецік, наадварот, дапамагаў людзям, якія атрымлівалі пагрозы ад РНЕ зьвяртацца ў дзяржаўныя органы з мэтаю абароны іхніх правоў. Невыпадкова падчас вобыску былі канфіскаваныя ўся кампутарная тэхніка ды кнігі і паперы, якія датычыліся праваабарончай дзейнасьці Л.Сьвеціка. Гэта было зроблена з мэтаю перашкодзіць ягонай грамадзкай праваабарончай працы. 5 скаргаў, падрыхтаваныя з яго ўдзелам, тычыліся парушэньняў уладамі правоў беларускіх грамадзянаў. Яны былі


Леанід Сьвецік.

прынятыя да разгляду Камітэтам па правах чалавека ААН у Жэневе.

Трэба адзначыць, што беларускія праваахоўныя органы часта не даюць прававой ацэнкі праявам экстрэмізму ў дзейнасьці неанацысцкіх груповак у краіне, а замест гэтага аказваюць маральны і псіхалагічны ціск на праваабаронцаў і грамадзкіх актывістаў.

Мы, беларускія праваабаронцы, вельмі занепакоеныя фактамі неабгрунтаванага ціску на Леаніда Сьвеціка. Мы будзем надаваць гэтаму інцыдэнту пільную ўвагу ды інфармаваць міжнародную супольнасьць пра ўсе наступныя дзеяньні беларускіх уладаў супраць праваабаронцы Леаніда Сьвеціка".

# "Яны прагнуць вясны ў Беларусі"




29 траўня ў сядзібе Партыі БНФ у Менску адбылася прэзентацыя кнігі "Прага вясны. Крымінальныя прысуды, вынесеныя ў 2007 годзе па палітычных матывах", падрыхтаваная з удзелам беларускіх праваабаронцаў.

У зборніку зьмешчаныя публіцыстычныя артыкулы розных аўтараў, героямі твораў зьяўляюцца асобы, прыцягнутыя ў мінулым годзе да крымінальнай адказнасьці за сваю грамадска-палітычную дзейнасьць ці погляды. Гэта – Канстанцін Лукашоў, Зміцер Федарук, Барыс Гарэцкі, Алег Корбан, Аляксей Янушэўскі, Наста Палажанка, Валер Шчукін, Андрэй Клімаў, Наста Азарка, Іван Шыла, Яраслаў Грышчэня, Зьміцер Дашкевіч, Наталя Ільініч, Артур Фінькевіч.

Якраз год таму, 29 траўня, былі вынесеныя прысуды ў крымінальнай справе супраць пяцярых сяброў Маладога Фронту, якіх абвінавацілі ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Да гэтай даты і была прымеркаваная прэзентацыя кнігі, сярод герояў якой таксама і маладафронтаўцы.

Падчас прэзентацыі праваабаронцы павіншавалі з днём народзінаў маладафронтаўца Аляксея Янушэўскага, якому 29 траўня споўніўся 21 год. Аляксей – адзін з герояў кнігі. Ён быў аштрафаваны за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі: "Я працягваю дзейнасьць, зьяўляюся сябрам Маладога Фронту. Гэтая крымінальная справа мяне не зламала. Працягваю займацца тым, чым займаўся год таму. Вучуся ў Віленскім педагагічным універсітэце на факультэце славістыкі."

Сярод герояў кнігі – навуковец Канстанцін Лукашоў, які стаў летась першым асуджаным па палітычных матывах. Ён асуджаны на два гады пазбаўленьня волі ўмоўна з адтэрміноўкай на два гады. Канстанцін невыязны і ня мае магчымасьці ўзяць удзел у геалагічным кангрэсе ў Нарвегіі: "У мяне там быў вялікі даклад, прысьвечаны геамедыцыне і ўнёску беларускіх навукоўцаў у разьвіцьцё гэтай маладой навукі. Ізноў гэта адбіваецца толькі на іміджы дзяржавы. Раней, калі мы прадстаўлялі сваю краіну сваімі працамі, нягледзячы на тое, які ў нас рэжым, усё ж на нас глядзелі па нашых дасягненьнях. Але зараз будуць глядзець толькі на рэжым".

Яшчэ адзін з герояў кнігі – былы палітвязень Андрэй Клімаў, асуджаны за публіцыстычны артыкул, зьмешчаны ў Інтэрнэце. Ён прыйшоў на прэзентацыю разам з маці і жонкай. Андрэй распавёў, што падрыхтаваў да выданьня новую кнігу "Трыумф авантурыста", дзе, між іншым, апавядае падрабязнасьці закрытага судовага працэсу над сабой. Ён сказаў: "Я лічу, гэта ганьба для нашай краіны, што ў XXI стагодзьдзі ў нас садзяць іншадумцаў. Тое ўзрушэньне, зьвязанае з арыштам, прымусіла мяне прысьвяціць шмат часу сям’і. Я на хатнім арышце добраахвотным. І я думаю, што большай радасьці для маіх дзяцей, маіх родных няма. Я ўдзячны лёсу за ўсё, што са мной было. Бо я жывы і зноў з вамі."

Праваабаронца Алесь Бяляцкі мяркуе, што працяг у гэтай кнігі будзе, бо за гэты год ужо 16 чалавек асуджаныя па палітычных матывах. Пра назву кнігі ён сказаў: "Прага вясны" – гэта адначасова можна казаць і пра вясновую Прагу, пра згадкі таго, што адбылося ў Празе на пачатку 90-х гадоў, і тое, што гэтыя людзі прагнуць вясны ў Беларусі".

# Лідэр з вялікай літары

## Палітвязьня Сяргея Парсюкевіча на волі чакаюць жонка, сын і маці

23 красавіка суд Маскоўскага раёну Менску асудзіў старшыню Рады прадпрымальнікаў Смаленскага рынку Віцебску Сяргея Парсюкевіча на 2,5 гады зьняволеньня. Апроч таго, ён мусіць выплаціць міліцыянту Аляксандру Дулубу 1 мільён рублёў кампенсацыі: паводле сьледзтва, у турме на Акрэсьціна Парсюкевіч нібыта зьбіў ахоўніка. Сябры і калегі асуджанага перакананыя: сапраўднай прычынай расправы стаў актыўны ўдзел Парсюкевіча ў прадпрымальніцкіх акцыях на пачатку году.

14 траўня Сяргею Парсюкевічу споўніўся 41 год. У дзень нарадзінаў Сяргея Парсюкевіча ягоная жонка Наталя ня здолела павіншаваць мужа. На той момант яго ўжо перавялі ў адну з самых жорсткіх паводле ўмоваў утрыманьня турму ў Жодзіне, куды на сустрэчу трапіць ня так проста. Трэба прайсьці вялікае мноства інстанцыяў, усе яны ў Менску, а Парсюкевічы з 13-гадовым сынам жывуць у Віцебску. Там Наталя прывязаная да графіку працы дзяржаўнага прадпрыемства. А дома – да працы, якой раней займаўся Сяргей: "Усё, што рабіў ён, цяпер раблю я. Уся мужчынская справа, якую ён выконваў у нашай гаспадарцы, цяпер на мне. І на Дзянісу, натуральна. Дзяніс на лецішчы ўсю фізічную працу намагаецца рабіць. Вядома, якая яму як падлетку пад сілу..."

Сяргей Парсюкевіч нарадзіўся 14 траўня 1967 году ў Віцебску. Закончыў матэматычны клас 31-й сярэдняй школы, паступіў у Ленінградзкую ваенную акадэмію імя Мажайскага на факультэт ваенна-касьмічных войскаў. Бацькі былі супраць такога выбару адзінага сына. Асабліва што да бацькі, які на той час кіраваў у Віцебску буйным станкарамонтным прадпрыемствам, быў паважаным чалавекам у асяродку гаспадарнікаў і мог істотна дапамагчы Сяргею з прафесійным выбарам. Але сын аказаўся непахісны.

Бацька Сяргея не дажыў да часу, калі ягоны сын апынуўся за кратамі. З гэтай сямейнай бядой зараз жывуць маці, якая ўсё жыццё адпрацавала ў радзільным доме фельчаркай-акушэркаю, а таксама жонка Наталя і сын.

### Байканур — Віцебск: канец касьмічнай адысеі

Крымінальную будучыню Парсюкевічу ня мог бы спрагназаваць нават самы сьмелы фантаст. Пасьля заканчэньня акадэміі Сяргей Парсюкевіч атрымаў разьмеркаваньне на знакаміты касмадром Байканур. Адрас вайсковай прапіскі — гарадок Ленінскі, пляцоўка № 10. Там ён пазнаёміўся з будучай жонкай Наталяй, чые бацькі працавалі ў вайсковых частках Байкануру. Вясельле згулялі ў 1990 годзе. Кар'ера складалася надзвычай пасьпяхова, даслужыўся да капітана. Але разваліўся Савецкі Саюз, пачаўся падзел маёмасьці паміж новымі краінамі. Да таго ж, пачало падводзіць здароўе, бо за службу зарабіў астму — дало сябе знаць тое, што меў справу з ракетным палівам.

За пару гадоў безгаспадарнасьці, калі на тэрыторыю вайсковай часткі засялілі мясцовых казахаў, уся колісь бездакорная інфраструктура развалілася. У Сяргея якраз скончаўся кантракт, і сям'я вырашыла зьязджаць у Беларусь. У 1994-м Наталя паехала ў Віцебск нараджаць сына Дзяніса. А праз год надышоў канец і службе капітана ваенна-касьмічных войскаў Сяргея Парсюкевіча. Дарэчы, у Віцебску Сяргей хутка стаў мясцовай знакамітасьцю, і напярэдадні Дня касманаўтыкі віцебскія газеты часта друкавалі з ім інтэрв'ю на тэмы беларускіх персьпектываў у космасе.

У Віцебску Парсюкевічы набылі кватэру — балазе грошай на Байкануры зарабілі; чымсьці дапамаглі бацькі. У той двухпакаёўцы яны жывуць і да сёньняшняга дня.

Неўзабаве Сяргей уладкаваўся ў міліцыю. Была прапанова працаваць у КДБ, але адмовіўся. Служыў у экспертным аддзеле Кастрычніцкага РУУС Віцебску, за старанную працу быў уганараваны, ягонае фота было на Дошцы гонару ўпраўленьня ўнутраных справаў Віцебскай вобласьці. Потым перавялі ў Чыгуначны РУУС на пасаду начальніка эксьпертна-крыміналістычнага аддзелу. Але ўсё больш непакоіла астма. Да 2003 году назапасілася значная выслуга, якая давала льготы на бясплатныя лекі — на Байкануры год ішоў за паўтара. Сяргей вырашае звольніцца паводле стану здароўя.

Аднак чымсьці трэба было займацца, а з працай у горадзе — праблемы. У 2003-м зарэгістраваўся як індывідуальны прадпрымальнік. Пачаў працаваць, дапамагала жонка. Усё складалася ўдала. Увогуле, як кажуць ягоныя знаёмыя, гэты чалавек з шэрагу тых, хто працы не баіцца і ў каго задуманае, як правіла, рэалізоўвалася. Таму для ўсіх вялікай нечаканасьцю стала тое, што старанны і законапаслухмяны Парсюкевіч раптам стаў крымінальнікам.

Уладзімір, таварыш Сяргея Парсюкевіча па службе на Байкануры, лічыць, што вытокі сёньняшніх падзеяў вакол Парсюкевіча бяруць пачатак у 1990-х. Каб не развал арміі, яны да сёньня заставаліся б у казахстанскіх стэпах. Але тое, што адбылося цяпер, — сплянаваная акцыя: "Ну, гэта проста ні ў якія рамкі ня лезе. Ён сам працаваў у міліцыі, цудоўна ведае ўсе законы. І які сэнс гэтым было займацца, ведаючы, якія могуць быць наступствы? Таму лічу тое, што адбылося, чыстай вады правакацыяй. Ён заўсёды быў законапаслухмяным грамадзянінам, ніколі за ім ніякіх прыводаў ня значылася, тым больш колькі гадоў адпрацаваў у міліцыі. Таму ад той навіны быў проста шокавы стан. Да гэтага часу ніхто ня можа адысьці. Ня толькі я, шмат хто яго ведае, шмат сяброў у Расіі, з кім служылі, мы перапісваемся, і ўсе ў шоку. Я ў ім упэўнены на ўсе 150%. Мы з ім поплеч адслужылі пяць гадоў, жылі ў адным інтэрнаце, яшчэ калі былі нежанатыя. Былі розныя сітуацыі, а мы ж займаліся запускам ракет, гэта сур'ёзная справа. Таму Сяргея я магу характарызаваць як надзейнага, прыстойнага і сумленнага чалавека".


Сяргей Парсюкевіч за кратамі.

### 2006: год – год радыкальных пераменаў

Годам кардынальных зьменаў у жыцьці Сяргея Парсюкевіча стаў 2006-ы – год прэзідэнцкіх выбараў. Ён стаў актывістам каманды кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча. Дагэтуль да палітыкі ставіўся спакойна. Але ўрэшце ягоныя погляды перасталі супадаць з афіцыйнымі. Якраз тады ён адседзеў першыя свае палітычныя суткі — статус назіральніка за выбарамі ад штабу Мілінкевіча выліўся ў 5 сутак адміністратыўнага арышту. 19 сакавіка да скрыні галасаваньня яго прывёў міліцыянт.

Пасьля выбараў пачаліся непрыемнасьці ў бізнэсе. У 2007, як крыху аціхлі палітычныя жарсьці, пачаў змагацца за правы індывідуальных прадпрымальнікаў на Смаленскім рынку. Калі ў кагосьці адбіралі тавар, арганізоўваў акцыі пратэсту. Тавар пад напорам вярталі. З гэтага пачаліся сур'ёзныя сутычкі з дырэктарам рынку. Мінулым летам пад небясьпекай забароны гандлю апынуўся і сам.

(Працяг на стар. 7)

# Моладзевы супрацiў не спынiць!

## Артура Фiнькевiча завочна асудзiлi на 7 сутак

15 траўня 2008 году суд Першамайскага раёну завочна асудзiў намесьнiка старшынi Маладога Фронту Артура Фiнькевiча на адмiнiстрацыйны арышт тэрмiнам на 7 сутак.

Падставаю да гэтага прысуду стаў пратакол, складзены супрацоўнiкамi Першамайскага РАУС пасьля затрыманьня Фiнькевiча каля Нацыянальнай бiблiятэкi 1 траўня, дзе ён браў удзел у мiрнай акцыi, прымеркаванай да Дня Еўропы. Супрацоўнiкi РАУС абвiнавацiлi ўсiх затрыманых, у тым лiку Артура Фiнькевiча, па ч.3 артыкулу 23.34 Кодэксу аб адмiнiстрацыйных парушэньнях (актыўны ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве), склалi на iх пратаколы i выпусьцiлi, узяўшы падпiску пра абавязак зьявiцца на першым патрабаваньнi.

Нiводнага разу пасьля 1 траўня Артура нiхто ня выклiкаў нi ў суд, нi ў РАУС. Пры гэтым, паводле ч.1 артыкулу 11.4 Працэсуальна-адмiнiстрацыйнага Кодэксу, суд ня мае права разглядаць справу ў адсутнасьцi абвiнавачваемага, акрамя як у сiтуацыях, калi абвiнавачваемы прызнаў сваю вiнаватасьць альбо неаднаразова iгнараваў позвы суду.

Тым ня менш, 15 траўня адбылося паседжаньне, пра якое ня ведаў нi Фiнькевiч, нi адвакат, якi



Артур Фiнькевiч.

мусiў абараняць Артура ў судзе. Пра прысуд самому Артуру стала вядома толькi 19 траўня, калi яму дадому патэлефанаваў супрацоўнiк Першамайскага РАУС г. Менску i пацiкавiўся, як яго знайсьцi. Супрацоўнiк РАУС паведамiў мацi Артура, што судом Першамайскага РАУС яе сын асуджаны да арышту i РАУС зьбiраецца аб'явiць яго ў адмiнiстрацыйны вышук.

Адпаведна Кодэксу аб адмiнiстрацыйных правапарушэньнях, рашэньне суда Першамайскага раёну супярэчыць закону i зьяўляецца неправамоцным.

Артур пракаментаваў гэтую сiтуацыю па тэлефоне прэс-службе Маладога Фронту: "13 траўня мяне спрабавалi не прапусьцiць праз беларускую мяжу, калi я ехаў у Вiльню на падпiсаньне пагадненьня з Маладымi Хрысьцiянскiмi дэмакратамi Лiтвы. Тады мы, дзякуючы разуменьню памежнiкаў, здолелi даехаць да Вiльнi. Тым ня менш, па дарозе дадому з Вiльнi мне паставiлi штамп, што я часова пазбаўлены права выязджаць з Беларусi. На наступны дзень, калi я наведаў аддзел па грамадзянству i мiграцыi, мне прынесьлi прабачэньнi i патлумачылi, што я трапiў у базу выпадкова. А лiтаральна праз тыдзень сiтуацыя паўтарылася – i гэта пацьвярджае, што беларускiя сьпецслужбы адмыслова працуюць над тым, каб перашкодзiць мiжнароднай дзейнасьцi Маладога Фронту.

Але я запэўнiваю, што працу Маладога Фронту нiхто ня спынiць, нi непасрэдна ў Беларусi, нi на мiжнароднай арэне. Рэжым ужо спрабаваў спынiць дзейнасьць нашае арганiзацыi з дапамогаю крымiнальнага кодэксу, але ён пралiчыўся. Дык няхай там ня думаюць, што сваiм дробязным бясправаем спыняць моладзевы супрацiў. Моладзь сталее, бярэ на сябе адказнасьць ва ўсiх сферах грамадзка-палiтычнага жыцьця Беларусi, i я перакананы, што нашае пакаленьне вельмi хутка спынiць тое беззаконьне, якое пакуль яшчэ творыцца на Беларусi!"

# Заклiкаў да далучэньня Беларусi да Еўрасаюзу

21 траўня суд Першамайскага раёну асудзiў лiдэра Маладога Фронту, Зьмiтра Дашкевiча на адмiнiстрацыйны арышт тэрмiнам на 7 сутак. Судовы працэс адбываўся паводле пратаколу, складзенага на Зьмiтра за ўдзел у акцыi "Дзень Еўропы", якую ладзiлi сябры кампанii "Еўрапейская Беларусь" 1 траўня 2008 году ля Нацыянальнай бiблiятэкi. Раней за гэтую ж акцыю быў асуджаны лiдэр БСДГ Мiкалай Статкевiч. Падчас правядзеньня мiрнае акцыi многiя ўдзельнiкi яе былi зьбiтыя, супрацоўнiкi сiлавых структураў рвалi i канфiскоўвалi ў актывiстаў дэмакратычнага руху еўрапейскiя сьцягi.

"Выкрыкваў лозунгi, заклiкi аб далучэньнi Беларусi да Еўрасаюзу, чым парушыў усталяваны парадак арганiзацыi i правядзеньня масавых мерапрыемстваў у Рэспублiцы Беларусь", – гаворыцца ў пастанове суда Першамайскага раёну аб арышце Зьмiтра Дашкевiча.

Каментар з нагоды чарговых судовых выракаў за мiрныя акцыi дала амбасадар Францыi ў Беларусi Мюрэй Мюсо. Нагадаем, Францыя, у дадатак да сваiх асноўных функцыяў, зьяўляецца прадстаўнiком Еўрасаюзу ў Беларусi.

– Мы выказваем глыбокае шкадаваньне ў сувязi з прысудамi, вынесенымi Зьмiтру Дашкевiчу, а таксама Мiкалаю Статкевiчу i Артуру Фiнькевiчу, якiя прымалi ўдзел у сьвяткаваньнi 1 траўня 2008 году, – кажа Мюрэй Мюсо. – Мы нагадваем, што свабода сходаў i свабода выказваньня думак зьяўляюцца фундаментальнымi правамi кожнага грамадзянiна дэмакратычнай краiны i заклiкаем беларускiя ўлады да выкананьня гэтых правоў у межах абавязацельстваў, прынятых на сябе Беларусьсю, якая зьяўляецца сябрам ААН i АБСЕ. Мы асаблiва шакаваныя тым, што прысуды заснаваныя на заклiках манiфестантаў да зблiжэньня з Еўрасаюзам, у той час, калi беларускiя ўлады выказваюць пастаяннае жаданьне да правядзеньня больш шчыльнага дыялогу з Еўрапейскiм Саюзам па ўсiх накiрунках".

# "Усё добра. Усё чотка..."




Менск, 16 траўня 2008 г.

Актывiсты грамадзянскай кампанii "Еўрапейская Беларусь" у алегарычнай форме зьвярнулi ўвагу жыхароў сталiцы на становiшча ў сферы СМI.

16 траўня каля кiнатэатру "Кастрычнiк" можна было назiраць такую карцiну: насупраць старога савецкага тэлевiзару з надпiсам на экране "БТ" i субтытрамi "Усё добра. Усё чотка" на нумарах газеты "Советская Белоруссия" сядзела каля двух дзясяткаў маладых людзей. У iх былi залепленыя скотчам раты, а рукi закладзеныя за сьпiну. Так доўжылася прыкладна з хвiлiну. Пасьля моладзь устала, пазьдзiрала з сябе скотч, скамячыла газеты. Тэлевiзар выкiнулi ў сьметнiцу каля выхаду з метро. Мiнакi зьдзiўлена фатаграфавалi тое, што адбывалася, але пытаньняў не задавалi...

Нiхто з удзельнiкаў перформансу ад мiлiцыянтаў не пацярпеў.

# Перасьлед Радыё "Рацыя" працягваецца

## "Рэпарцёры бяз межаў" асуджаюць адмову ў акрэдытацыі карэспандэнту Радыё "Рацыя"

Міжнародная арганізацыя "Рэпарцёры бяз межаў" выступіла з асуджэньнем рашэньня Міністэрства замежных справаў Беларусі, якое 28 траўня адмовіла ў акрэдытацыі карэспандэнту Радыё "Рацыя" Аляксею Мінчонку. Адпаведная заява з'явілася 30 траўня на сайце "Рэпарцёраў".

"Беларускія ўлады працягваюць перасьлед Радыё "Рацыя", аднаго з нешматлікіх незалежных СМІ ў Беларусі, — гаворыцца ў заяве. — Мы заклікаем да спыненьня гэтага адміністрацыйнага перасьледу, які матываваны выключна палітычнымі меркаваньнямі".

Нагадаем, што карэспандэнт Радыё "Рацыя" — радыёстанцыі, якая вяшчае на тэрыторыю Беларусі з суседняй Польшчы – Аляксей Мінчонак зьвярнуўся па акрэдытацыю ў беларускі МЗС, але атрымаў адмову. Адмова грунтуецца на тым факце, што Аляксей "раней займаўся журналісцкай дзейнасьцю на карысьць замежнага СМІ без акрэдытацыі пры МЗС".

"Я запытаўся ў супрацоўніка МЗС, які зачытаў мне рашэньне, дзе я магу пазнаёміцца з прычынамі праз якія карэспандэнту могуць адмовіць у акрэдытацыі. Ён сказаў, што на афіцыйным сайце МЗС. Я толькі што паглядзеў Палажэньне аб акрэдытацыі карэспандэнтаў замежных СМІ ў Беларусі, і там няма ні слова пра прычыны, праз якія могуць адмовіць. Яшчэ параюся з юрыстамі і кіраўніцтвам радыёстанцыі і, верагодна, буду падаваць у суд", – кажа А.Мінчонак.

"Гэтае рашэньне зьяўляецца абсурдным. З аднаго боку, Міністэрства замежных справаў перасьледуе нас за працу без акрэдытацыі, а з іншага боку — само працягвае адмаўляць нам у акрэдытацыі", — заявіў сп. Мінчонак у размове з прадстаўнікамі "Рэпарцёраў бяз межаў".

Журналіст падаў дакументы на акрэдытацыю пасьля ператрусаў у офісах незалежных радыёстанцыяў 27 сакавіка. Яго ініцыятыву падтрымала кіраўніцтва "Рацыі", і 28 красавіка журналіст накіраваў у МЗС усе неабходныя паперы. Як бачым, гэтага аказалася замала, каб мець магчымасьць афіцыйна працаваць на тэрыторыі Беларусі.

Нагадаем таксама, што ў офісе Радыё "Рацыя" ў Менску супрацоўнікі КДБ правяліператрус з канфіскацыяй тэхнікі сёлета 27 сакавіка.

# Скаргу зноў адхілілі

Рэдакцыі недзяржаўнай газеты "Витебский курьер М" зноў адмовілі ў праве ўнесьці зьмены ў Статут і перарэгістравацца. 20 траўня калегія Вышэйшага гаспадарчага суда (ВГС) адхіліла касацыйную скаргу ЗАТ "Выдавецкі дом "Витебский курьер" на рашэньні судоў папярэдніх інстанцыяў па гэтым пытаньні.

У 2007 г. ЗАТ "Выдавецкі дом "Витебский курьер" накіравала ў Віцебскі аблвыканкам дакументы на ўнясеньне зьменаў і дадаткаў у свой Статут. 11 кастрычніка 2007 г. выканаўчы камітэт даў адпаведны дазвол, але ўжо праз месяц, 12 лістапада 2007 году, сам жа яго адклікаў.

Гэтае рашэньне аблвыканкаму "Витебский курьер" спрабаваў абскардзіць у Гаспадарчым судзе Віцебскай вобласьці. 18 лютага суд адхіліў скаргу, а 18 сакавіка, пасля разгляду апеляцыйнай скаргі, пакінуў сваё ж рашэньне ў сіле.

Юрыдычны кансультант ЗАТ "Выдавецкі дом "Витебский курьер" Павел Левінаў, які прадстаўляў інтарэсы рэдакцыі і ў Вышэйшым гаспадарчым, і ў папярэдніх судах, расчараваны вынікам слуханьняў. "У мяне была надзея, што Вышэйшы гаспадарчы суд зможа разабрацца ў гэтай нескладанай, на мой погляд, сітуацыі. Але, відаць, ім не далі", — зазначыў юрыст у гутарцы з прэс-службай БАЖ.

Прадстаўнікі Выдавецкага дому пакуль не вырашылі, ці падаваць у прэзідыум Вышэйшага гаспадарчага суда скаргу ў парадку нагляду.

Недзяржаўная газета "Витебский курьер М" аднавіла выхад сёлета ў канцы красавіка пасля амаль гадавога перапынку і цяпер друкуецца ў Смаленску. Увесь наклад першага нумару (№ 1 за 25.04.2008) быў затрыманы ўвечары 24 красавіка — адразу пасьля таго, як яго прывезьлі ў Віцебск. Другі і трэці нумары выданьня трапілі да чытача.

# "Персона нон грата"?

20 траўня ветэрану пінскай журналістыкі Фёдару Глінскаму адмоўлена ў разьмяшчэньні публікацыяў на старонках гарадзкой дзяржаўнай газеты "Пінскі веснік", дзе ён працаваў да выхаду на пенсію і працягваў друкавацца дагэтуль. Як распавёў у гутарцы са службай маніторынгу БАЖ спадар Глінскі, у рэдакцыі "Пінскага весніка" яму патлумачылі, што прычынай таму стала яго супрацоўніцтва з недзяржаўнай газетай "Народная воля".

Па словах журналіста, напрыканцы мінулага тыдня галоўны рэдактар "Пінскага весніка" Марыя Ляшук сказала яму, каб ён больш нічога для газеты не пісаў, бо для яго артыкулаў няма свабоднай плошчы. І далей, прыгадаўшы публікацыі Глінскага ў "Народнай волі", рэдактарка патлумачыла, што недапушчальна, калі журналіст адначасова супрацоўнічае і з дзяржаўнай, і з недзяржаўнай газетамі.

# Пакараньне жывых за памяць пра мёртвых

21 траўня Рада Саюза беларускіх пісьменьнікаў прыняла заяву з асуджэньнем арышту свайго сябра, літаратара Віктара Хурсіка. Ён быў асуджаны судом Старадарожскага раёну да адміністрацыйнага арышту на 15 сутак па артыкуле 23.34 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі або правядзеньне масавага мерапрыемства або пікетаваньня) 15 траўня.

"Прычына беспрэцэдэнтнага гневу ўладнай Феміды (асудзіць за ўдзел ва ўсталяваньні крыжа!) палягае ў наступным: Віктар Хурсік адкрыў праўду аб трагедыі вёскі Дражна Старадарожскага раёну. Некалькі гадоў таму ў сваім нарысе на падставе сабраных матэрыялаў ён напісаў пра жахлівыя забойствы партызанамі жыхароў беларускай вёскі. Тэкст двойчы публікаваўся ў ягоных кнігах. 19 красавіка па ініцыятыве мемарыяльнай секцыі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры побач з могілкамі вёскі Дражна быў усталяваны і асьвечаны праваслаўным сьвятаром памятны шасьціканцовы крыж нябеснай заступніцы Беларусі сьвятой Еўфрасіньні Полацкай у памяць 25 мірных жыхароў, забітых партызанамі 2-й Менскай партызанскай брыгады 15 красавіка 1943 году. Імёны загінулых пералічаныя на мемарыяльнай шыльдзе, прымацаванай да крыжа. У цырымоніі ўдзельнічалі і відавочцы трагедыі. Праз некалькі дзён рашэньнем мясцовых уладаў памятны крыж быў дэмантаваны. Мы абураныя з прычыны ганебнага перасьледу пісьменьніка Віктара Хурсіка за ягонае бескампраміснае асьвятленьне нашага мінулага і выказваем сваю салідарнасьць з ім.


Віктар Хурсік.

Прысуд Віктару Хурсіку – зьява беспрэцэдэнтная. Гэта першае ў нашай гісторыі пакараньне жывых за памяць пра мёртвых" – гаворыцца ў заяве Рады СБП.

## Уладзімір ЛАБКОВІЧ:
# "Мінюст ператварыўся ў карны орган"

***У Вярхоўным судзе не задаволілі скаргу ГА "БНФ "Адраджэньне" на Міністэрства юстыцыі.***

30 траўня ў Вярхоўным судзе Беларусі было вынесенае рашэньне па скарзе грамадзкага аб'яднаньня "БНФ "Адраджэньне" на Міністэрства юстыцыі. Скарга Вярхоўным судом не задаволеная.

Міністэрства юстыцыі яшчэ ў красавіку вынесла пісьмовае папярэджаньне грамадзкаму аб'яднаньню "БНФ "Адраджэньне" ў зьвязку з тым, што яе гарадзенская абласная структура ня мае юрыдычнага адрасу. Прадстаўнікі аб'яднаньня сьцьвярджаюць, што гэтае папярэджаньне было неабгрунтаваным. Гаворыць сябра сойму БНФ Юры Чавусаў: "Дзякуючы намаганьням лідзкай арганізацыі гарадзенская абласная арганізацыя атрымала юрыдычны адрас. І ў Мінюст паведамлялася, што ўсё зроблена, дакументы перадаюцца. Але чамусьці яны перададзеныя не былі. У тых варунках, у якіх мы працуем, гэтага трэба было чакаць. Сітуацыя стандартная. На мой погляд, патрабаваньні занадта строгія – забарона рэгістравацца на кватэрах. Ранейшы юрыдычны адрас быў на кватэры, і патрабавалі памяняць на адміністрацыйны".

Падчас разгляду скаргі 28 траўня высьветлілася, што прадмет спрэчкі ўжо ліквідаваны: 16 траўня ўпраўленьне юстыцыі зьняло з уліку гарадзенскую абласную арганізацыю, фактычна яе ліквідавала. "Яны не дачакаліся выніку разгляду справы ў судзе. Але мы ўсе ведаем, якія рашэньні прымае суд".

Адказны сакратар Управы Партыі БНФ, юрыст Уладзімір Лабковіч заявіў: "Папярэджаньне Міністэрства юстыцыі насамрэч перасьледуе выключна палітычныя мэты. Скіравана на тое, каб яшчэ больш абмежаваць магчымасьці грамадзкім аб'яднаньням, палітычным партыям у іх дзейнасьці напярэдадні парламенцкіх выбараў. Ліквідацыя структураў абласнога ўзроўню цягне за сабой пэўныя абмежаваньні па вылучэньні прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі і па назіраньні. Таму гэта працяг той зачысткі, якая праводзілася напярэдадні мінулых парламенцкіх выбараў, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. На жаль, Міністэрства юстыцыі ператварылася выключна ў карны орган".

# Гэта экалагічная дыверсія...
## Прэзідэнту адправілі 6.000 подпісаў супраць будаўніцтва заводу ядахімікатаў

Жыхары пасёлку Дружны зьвярнуліся да Аляксандра Лукашэнкі з лістом. Шэсьць тысячаў грамадзянаў пратэстуюць супраць будаўніцтва побач з пасёлкам заводу па вытворчасьці пестыцыдаў, а таксама супраць ціску на грамадзкасьць з боку мясцовых уладаў і міліцыі.

Ліст на імя Лукашэнкі падпісала адна з актывістак грамадзкага супраціву Тацяна Рысявец. Да ліста прыкладзены 6 тысячаў подпісаў мясцовых жыхароў.

Тацяна Рысявец кажа, што "надышоў момант, калі трэба называць рэчы сваімі імёнамі. Людзей запалохваюць самымі рознымі спосабамі, праслухоўваюць тэлефоны. Мяне вінавацяць, што я заклікаю людзей на барыкады, што арганізоўваю непарадкі. Таму я вырашыла зьвярнуцца ад свайго імя, а подпісы прыклала для таго, каб было відаць, колькі людзей супраць. І гэта толькі частка людзей, бо мы сьпяшаліся і зьбіралі подпісы толькі чатыры дні. Інакш іх было б у некалькі разоў больш".

Тацяна Рысявец таксама паведаміла, што супрацоўнікі міліцыі склалі на яе адміністрацыйны пратакол паводле артыкулу аб арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу 25 сакавіка. Неўзабаве над ёй адбудзецца суд. Тым часам пратэстныя настроі жыхароў пасёлку Дружны становяцца больш радыкальнымі.

Па словах яшчэ адной актывісткі ініцыятыўнай групы Алены Будкоўскай: "Кожны дзень ад людзей чуеш, што трэба самім разабраць тое, што ўжо пабудавана, запакаваць і адправіць у Расію. Альбо аплаціць ім дарогу, альбо ўвогуле зьнішчыць. Гэта сьведчыць пра тое, што ў грамадстве ўзьнікла нядобрая напружанасьць".

Заяву супраць будаўніцтва заводу з подпісамі 6 тысячаў жыхароў Дружнага актывісты ініцыятыўнай групы накіроўвалі таксама ў Пракуратуру, Канстытуцыйны суд і ўрад краіны. Адказ яны меліся атрымаць да 14 траўня, аднак вышэйшыя дзяржаўныя ўстановы пакуль маўчаць.

Грамадзкі актывіст Сяргей Абразоўскі кажа пра далейшыя крокі ў такіх абставінах: "Перадусім будзем падаваць у суд на ўрад і аблвыканкам, будзем спрабаваць зьвяртацца ў міжнародныя структуры па дапамогу. Калі ўладныя структуры сваёй дзяржавы дзейнічаюць супраць інтарэсаў насельніцтва, значыць, трэба выходзіць на тыя структуры, якія падтрымліваюць насельніцтва. На тыя палітычныя партыі, якія падтрымліваюць насельніцтва. Іншага выйсьця ў нас папросту няма."

17 траўня ў Мар'інай Горцы, адміністрацыйным цэнтры Пухавіцкага раёну, адбыўся сход з удзелам кіраўніка Акадэміі навук Міхаіла Мясьніковіча, прадстаўнікоў міністэрстваў прыродных рэсурсаў, аховы здароўя, кіраўніцтва Менскай вобласьці і Пухавіцкага раёну. Аднак на гэты мітынг не пусьцілі ніводнага з тых 6 тысячаў чалавек, якія паставілі свае подпісы супраць будаўніцтва заводу.

Нагадаем, будаўніцтва заводу па вытворчасьці пестыцыдаў распачынае расійская прыватная кампанія "Август-Бел". Супраць будаўніцтва заводу пратэстуюць жыхары пасёлку Дружны, Сьвіслачы, Рудзенску, Дукоры і іншых паселішчаў. Яны ня вераць у праўдзівасьць афіцыйных заяваў і высноваў дзяржаўных экспертаў і дамагаюцца незалежнай экалагічнай экспертызы і мясцовага рэферэндуму пра мэтазгоднасьць будаўніцтва шкоднай вытворчасьці. Дзяржаўныя чыноўнікі заяўляюць, што канчаткова гэтае пытаньне павінен вырашыць урад краіны. Аднак у прадстаўніцтве кампаніі "Август-Бел" паведамілі, што неабходныя дакументы на будаўніцтва атрыманыя і ўжо вядзецца набор працоўнага персаналу.

Актывісты ініцыятыўнай групы супраць будаўніцтва заводу рыхтуюць дакументы ў суд на кампанію "Август-Бел", а таксама на мясцовыя ўлады паводле фактаў парушэньня дзейнага заканадаўства пры падрыхтоўцы да будаўніцтва завода. Патрабаваньні насельніцтва тутэйшых паселішчаў былі накіраваныя ў структуры ўлады. Пра выніку перапіскі кажа грамадзкая актывістка Алена Будкоўская: "З Савету Міністраў адказу не было. Не адказвае пакуль Менскі аблвыканкам. Маўчыць і Пухавіцкі райвыканкам на тое, што мы дасылалі яшчэ 14 красавіка."

## Зноў аштрафаваны актывіст Сяргей Абразоўскі

**22 траўня судзьдзя Пухавіцкага райсуда Сьвятлана Акуліч аштрафавала грамадзкага актывіста Сяргея Абразоўскага на 1 млн. 400 тыс. рублёў. Ён абвінавачаны ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу пратэсту жыхароў пасёлку Сьвіслач 29 сакавіка.**

**Сяргей Абразоўскі ня згодны з прысудам. Ён кажа, што ў суботу 29 сакавіка прысутнічаў на футбольным матчы, які праходзіў на стадыёне ў Сьвіслачы. Балельшчыкаў было шмат, і гутаркі між імі міліцыянты палічылі за сход. Сяргея Абразоўскага абвінавацілі ў несанкцыянаванай арганізацыі сходу на стадыёне.**

**Сяргея Абразоўскага ў другі раз караюць штрафам. Актывіст лічыць гэта запалохваньнем. Ён заяўляе, што ня спыніць барацьбы супраць намеру ўладаў пабудаваць хімічны завод у пасёлку Дружны, дзе цяпер жывуць перасяленцы з раёнаў, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.**

# Лідэр з вялікай літары

(Пачатак на стар. 3)

Новай прычынай незадавальненьня стаў указ Аляксандра Лукашэнкі № 760, якім прадпрымальнікам істотна абмяжоўвалася поле дзейнасьці. Хоць, як кажа Сяргеева жонка Наталя Парсюкевіч, іхняй сям'і той указ асабліва ня тычыўся: "Разумееце, у яго быў няспынны стан барацьбы. Як жанчына і маці сямейства, я яму спрабавала давесьці: цябе гэты ўказ не кране. У нас быў толькі адзін наняты прадавец, і, у прынцыпе, мы маглі без яго абысьціся. Мы проста бралі чалавека працаваць, таму што Сяргей ня можа доўга стаяць на марозе, бо ў яго астма. Толькі з-за гэтага. У нас быў толькі адзін-адзіны пункт на Смаленскім рынку. І ён проста змагаўся супраць існуючай несправядлівасьці".

Лакальныя хваляваньні супраць прэзідэнцкага ўказу паступова перарасьлі ў агульнанацыянальныя. Кульмінацыяй сталі выступы прадпрымальнікаў 10 і 21 студзеня ў Менску, калі былі зьбітыя і асуджаныя дзясяткі ўдзельнікаў мітынгаў. Сяргей Парсюкевіч быў актыўным удзельнікам усіх акцыяў як у абласным цэнтры, так і ў Менску. Хоць жонка была нязгодная, ставіў яе перад фактам, што ўжо ў дарозе ў сталіцу. Апошні прыезд у Менск стаў дарогай у адзін канец...

Парсюкевіч быў затрыманы 4 сакавіка ў будынку пракуратуры Маскоўскага раёну, куды прыйшоў даць паказаньні па заведзенай супраць яго крымінальнай справе – гвалт у дачыненьні да супрацоўніка міліцыі. Парсюкевіч нібыта зьбіў міліцыянта Дулуба, адбываючы адміністрацыйныя арышт за падзеі 10 студзеня ў сьпецпрыёмніку на вуліцы Акрэсьціна. Сам Парсюкевіч сьцьвярджае, што 21 студзеня яго жорстка зьбіў ахоўнік ізалятару. Аднак пазьней, каб пазьбегчы абвінавачаньняў у перавышэньні паўнамоцтваў, Дулуб пасьпяшаўся заявіць, што гэта яго пабіў арыштант.

Сябра Рады прадпрымальнікаў Смаленскага рынку Віцебску Генадзь Хвалько кажа, што выстаўляць Парсюкевіча баевікам, які зьбівае турэмную ахову, абсурдна: "Сяргей, як вы ведаеце, былы супрацоўнік праваахоўных органаў. Таму ён сам разумее, якія могуць быць наступствы ў той ці іншай сітуацыі. Калі казаць наконт "рэзкасьці", то ён непрымірымы да той сітуацыі, якая існуе. Той несправядлівасьці, якая ёсьць у адносінах да прадпрымальнікаў і ўвогуле ўсяго беларускага народу. А каб учыніць нейкія дзеяньні, як напад на ахоўніка, то я перакананы, што такога не магло быць у прынцыпе. Таму што чалавек адэкватны, ён кантралюе сітуацыю і як былы "опер" ведае, чым гэта можа скончыцца.

Адназначна, што ён не хацеў сядзець, бо хацеў змагацца і знаходзіцца побач з прадпрымальнікамі і працягваць барацьбу ў гэтай сферы. Наколькі ў яго гэта атрымлівалася, меркаваць, вядома, людзям. І ня толькі я, але і вялізная колькасьць прадпрымальнікаў скажуць, што гэта быў Лідэр з вялікай літары. Ён і застаецца ім. Усе, вядома, перажываюць за яго ў гэтай сітуацыі, але гэта быў і ёсьць Чалавек з вялікай літары".

## "Перажываю за тое, што адбываецца ў краіне"

**Палітвязень Сяргей Парсюкевіч даслаў ліст на волю: "Для мяне адсутнасьць свабоды, элементарная немагчымасьць проста ісьці куды табе хочацца, сустракацца з блізкімі людзьмі і сябрамі, моцна цісьне на псіхіку. Канешне, стараешся не паказваць выгляду. Але сумныя і раздражняючыя думкі ў галаве пастаянна. Да іх трэба дадаць клопат аб тым, як цяжка сям'і і блізкім. Акрамя маральных пакутаў на іх зваліліся справы і праблемы, якімі раней займаўся я сам, фінансавыя пытаньні. Калі раней асноўны даход у сям'і быў зароблены мной, то цяпер яны трацяць сродкі на маё ўтрыманьне.**

**Перажываю з той нагоды, што адбываецца ў краіне. Апошнія рэпрэсіі і адсутнасьць адэкватнага адказу з боку цывілізаванага чалавецтва на іх настрою не павышаюць. Адсутнасьць лістоў, аб'ектыўнай інфармацыі раздражняе. Я ўпэўнены, што мая жонка Наташа піша мне практычна кожны дзень. Ёсьць прычыны, па якіх лісты да мяне не даходзяць, няма і газетаў.**

**Уся сістэма турэмнага жыцьця краіны накіравана на прыніжэньне чалавека, які сюды патрапіў. Жодзіна ў гэтым напрамку мае "лепшыя" вынікі. Да асобы ставяцца горш, як да быдла. Я сам не магу так ставіцца ні да каго. І ўсё гэта на маіх вачах, і я нічога не магу з гэтым зрабіць.**

**Да бытавых праблемаў можна аднесьціся па-філасофску. Ну, нічога, што на 12 месцаў – 20 чалавек, і суткі ўвогуле няма ніякай вады. Бывае, усю ноч сядзіш у цемры, а легчы спаць няма куды.**

**На сьняданак – суп з кіслай капусты, а на вячэру – вараная кіслая капуста. Хапае прыступ астмы, а ты 20 хвілінаў грукаеш у дзьверы – мецъ у камеры інгалятар нельга.**

**Галоўнае застацца чалавекам, калі з цябе ўсімі сродкамі хочуць зрабіць быдла".**

# Моладзь пратэстуе...

(Пачатак на стар. 1)

што акцыя несанкцыянаваная і заклікаў людзей разысьціся. Пасьля гэтага амапаўцы сышлі з плошчы. У гэты час удзельнікі акцыі прад'явілі супрацоўніку міліцыі пастанову Вярхоўнага суда, у якой гаворыцца, што выхад з партрэтамі на вуліцы Менску не зьяўляецца несанкцыянаваным мерапрыемствам і не парушае ніякіх законаў. Аднак, нягледзячы на гэта, праз 10 хвілінаў на плошчу вярнуліся два дзясяткі амапаўцаў, якія сталі выцясняць людзей з плошчы. Удзельнікаў акцыі вялі "пад канвоем" да Белдзяржцырку. Вярнуцца назад на Кастрычніцкую плошчу людзям не дазволілі.



У акцыі салідарнасьці ўдзельнічалі асуджаныя па "справе 14-ці" актывісты. Сярод іх – актывісты грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" Таццяна Цішкевіч і Алесь Чарнышоў, сябры Аб'яднанай грамадзянскай партыі Міхаіл Пашкевіч, Міхаіл Крываў, актывіст Маладога Фронту Уладзімір Сяргееў. На плошчу таксама выйшлі іншыя актывісты "Еўрапейскай Беларусі", Маладога Фронту, АГП, партыі БНФ і простыя жыхары Менску.

Нагадаем, што роўна месяц таму, 16 красавіка, у судзе Цэнтральнага раёну Менску пачаўся судовы "Працэс 14-ці". 10 чалавек ужо асуджаныя. Сямёра з іх прысуджаныя да абмежаваньня волі на два гады без накіраваньня ў сьпецкамендатуру, двое аштрафаваныя. Андрэй Кім пазбаўлены волі на паўтара года.

У гэты ж дзень актывісты салігорскай філіі Маладога Фронту правялі акцыю, прысьвечаную агульнабеларускай кампаніі "Горад наш!" Нацыянальныя палотнішчы ўпрыгожылі галоўны праспект гораду шахцёраў.



Менск, 16 траўня 2008 г.

# Вяртаньне ў савецкія часы

***"Гісторыя Беларусі" зьнікне са школьнай праграмы ўжо з наступнага году. Гэта чарговы "лагічны" крок пасьля таго, як прадмет пачалі выкладаць па-руску. У праекце вучэбнага плану на наступны год замест "Гісторыя Беларусі" напісана проста – "гісторыя". Для новага прадмету рыхтуецца і адмысловы падручнік...***

Такую інфармацыю пацьвердзіла намесьніца начальніка ўпраўленьня агульнай сярэдняй адукацыі Мінадукацыі Валянціна Маеўская. Па словах чыноўніцы, цяпер працуе міжведамасная камісія, якая абмяркоўвае пытаньне пра аб'яднаньне дзьвюх прадметаў з новага навучальнага году: "Адно з пытаньняў – гэта зацьвярджэньне вучэбнага плану, у якім гэты прадмет будзе называцца "Гісторыя". Ён будзе складацца з двух частак. І выдзяляецца дзьве гадзіны. Адна гадзіна на гісторыю Беларусі, другая – на сусьветную гісторыю. І так, як было, так і застаецца. Проста ў вучэбным плане ён будзе называцца "Гісторыя".

Новы вучэбны план стане дадаткам да дэкрэту аб пераходзе на 11-гадовы тэрмін навучаньня ў школах. Пра гэта расказаў старшыня камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Здановіч. План "задавальняе ўсіх". А колькі дакладна гадзінаў будзе адведзена на гісторыю Беларусі ў агульным курсе гісторыі, Здановіч ня ведае: "Я ня ведаю, тут проста напісана "гісторыя", таму тут я не магу растлумачыць, ці то будзе гісторыя сярэдніх вякоў... і колькі гадзінаў на гісторыю Беларусі. Проста напісана слова "гісторыя". Калі мы абмяркоўвалі план, то ён задаволіў усіх".

Закрануць зьмены нават старэйшыя класы, якія ў сувязі з пераходам на 11-гадку, школу будуць заканчваць у "экстрэмальных умовах".

– Нават у пераходным тыповым вучэбным плане для тых 9-10 класаў, якія знаходзяцца цяпер у школе, – кажа У. Здановіч, – і якія будуць у такім экстрэмальным рэжыме заканчваць школу, напісана: гісторыя 2 гадзіны".

Настаўніца гісторыі менскай Гімназіі №12 Вольга Шаўцова пра надыходзячыя зьмены ведае. Кажа, што нібыта нават існуе адмысловы падручнік для новага прадмету. Праўда рыхтаваўся ён пад 12-годку: "Я пра гэта чула, я ведаю, што ёсьць падручнікі, іх падрыхтавалі ўжо. І там гісторыя ідзе як інтэграцыйны курс. Гэта значыць, што ў адным падручніку пасьлядоўна будзе выкладацца гісторыя сусьветная... і гісторыя Беларусі, калі гэтыя працэсы ахопліваюць нашу тэрыторыю. Падручнік будзе адзін, але ён быў падрыхтаваны для 12-гадовай школы. Што будзе цяпер з пачатку верасьня, я ня ведаю".

Вольга Шаўцова расказвае, што з настаўнікамі гісторыі наконт аб'яднаньня двух прадметаў ніхто ня раіўся. Але, магчыма, гэта і добрая ідэя, калі б толькі рабілася трошкі па-іншаму – настаўнікі былі супраць выкладаньня гісторыі роднай краіны па-руску: "У нас не пыталіся пра тое, ці трэба аб'ядноўваць гэтыя курсы. Тым ня менш многія былі згодныя, але не ў такім ракурсе. Мы, напрыклад, былі супраць таго, каб гісторыя Беларусі выкладалася на рускай мове. Настаўнікі гісторыі ўсё ж такі выступаюць за тое, каб гісторыя Беларусі выкладалася на роднай мове".

Незразумела, чаму і каму ўсё ж такі спатрэбілася аб'яднаць "Сусьветную гісторыю" з "Гісторыяй Беларусі". Настаўнікі і надалей маглі выкладаць гісторыю нашай краіны "комплексна". Як тое рабіла Вольга Шаўцова. Без агульнага падручніка: "Наогул гэта такі культурна-цывілізацыйны падыход. З гэтага пункту гледжаньня, гэта абсалютна правільна. Я, напрыклад, у любым выпадку працую сінхронна, хоць і не па інтэграцыйным падручніку. Я даю курс "сусьветкі" і пасьля разглядаю, якія працэсы адбываліся ў Беларусі, і як гісторыя сусьветная паўплывала на гэтыя працэсы ў нашай краіне".

Вядомы пісьменьнік і гісторык Уладзімір Арлоў называе такі крок спробай ператварыць нашую гісторыю з тысячагадовай у вельмі кароткую. Не выключае ён і таго, што чыноўнікі пойдуць на скарачэньне гадзінаў, адведзеных на гісторыю Беларусі: "Гістарычная памяць – гэта вялікая стваральная сіла, і гэта выдатна разумее любая ўлада. Ну, а наша ўлада гэтай сілы папросту баіцца. Мы ўжо не першы год назіраем спробы ператварыць нашую гісторыю з тысячагадовай ў гісторыю вельмі кароткую, якая пачынаецца можа толькі ў XX стагодзьдзі. Гэта чарговы крок. Мы зьяўляемся сьведкамі рэдагаваньня гісторыі, якую падпарадкоўваюць ідэалагічным нормам. Ня выключана, што будуць скарачаць гадзіны..."

Адзначу, што аб'яднаньне гісторыі Беларусі з сусьветнай гісторыяй – зьява ня новая, – сьцьвярджае У.Арлоў, – гэты крок вяртае нас у савецкія часы. Калі існаваў толькі адзін прадмет "Гісторыя", і выкладаўся па-руску.

# "Хто мы без душы, без культурнай спадчыны?"

## Настаўнікі сусьветнай мастацкай культуры просяць захаваць іх прадмет у школе

Настаўнікі сусьветнай мастацкай культуры больш чым з 20 гарадоў Беларусі выступілі з адкрытым лістом наконт запланаванага скарачэньня вучэбнай нагрузкі ў школе за кошт гуманітарных дысцыплінаў.

Тэкст адозвы БелаПАН перадала кіраўнік мазырскага раённага метадычнага аб'яднаньня настаўнікаў айчыннай і сусьветнай мастацкай культуры, аўтар шматлікіх прац па сваёй сьпецыяльнасьці Сьвятлана Філімонава.

Пад лістом стаяць прозьвішчы педагогаў з Гомелю, Гародні, Магілёву, Менску, Віцебску, раённых цэнтраў. Настаўнікаў падтрымала ўдава сусьветна вядомага рэчыцкага мастака Аляксандра Ісачова.

"Ідэя скараціць вучэбную нагрузку за кошт дысцыплінаў адукацыйнай галіны "мастацтвы", у тым ліку за кошт прадмету "айчынная і сусьветная мастацкая культура", гучыць як нонсэнс на фоне звароту прэзідэнта да народу і парламенту, у якім гаворка ішла аб духоўным здароўі нацыі. Дысцыпліна СМК — краевугольны камень у выхаваньні духоўнасьці нашых дзяцей. Усяго ў трох класах па адной гадзіне ў тыдзень адводзілася гэтаму прадмету. (Для параўнаньня: у Расіі СМК пачынаюць вывучаць з 5 класу і да выпуску).

У большасьці школьнікаў урокі матэматыкі будуць запатрабаваныя для пераліку грашовых купюраў у кашальках, хімія — для набыцьця мыйных сродкаў, біялогія — каб адрозьніць сардэчны боль ад ныркавага, геаграфія — для арыентацыі ў частках сьвету, фізіка ў быце абмяжуецца закіпаньнем вады ў чайніку. Але хто мы без душы, без культурнай спадчыны мінулага? З выхаваньнем у школьнікаў патрыятызму могуць справіцца толькі дысцыпліны галіны "мастацтвы". Менавіта яны ствараюць баланс "адукацыя-выхаваньне".

Заклікаем усіх, ад каго залежыць прыняцьце рашэньняў аб адукацыі: не зрабіце памылкі. Нашчадкі гэтага не даруюць", – гаворыцца ў лісьце настаўнікаў.

Як зазначыла С.Філімонава, падобныя лісты былі накіраваныя ў Адміністрацыю прэзідэнта і Беларускі экзархат.

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах.
Наклад 299 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.